Тыднёвік Магілёўскі

№ 8 (8)

16.05.97

Адно слова, панядзелак...

ЖЫЦЦЁ ПА ДЭКРЭТУ

Стараннае і няўхільнае выкананне нашай мясцовай уладай лукашэнкаўскага дэкрэту N 5 вымушае нас перанесці матэрыялы гэтай рубрыкі з унутраных палос газеты на першую.

Сёння мы паведамляем аб ходзе пасяджэння Ленінскага суда пад старшынствам Ніны Гаўрылюк над "палітычным рэцыдывістамі" Сяргеем Абадоўскім — юрыс-консультам Свабодных прафсаюзаў Беларусі (а на грамадскіх пачатках старшынёй рэгіянальнай арганізацыі СПБ) і Валадаром Цурпанавым — рабочым Магілёўскага завода ЖБІ (а на грамадскіх пачатках старшынёй гарадской філіі Беларускага Народнага Фронту). Аднаго судзілі "за организацию и участие в неразрешенных шествиях и митингах" ад 1 Мая бягучага года, а другога — за тое ж, толькі ад 26 красавіка. Такія ж зыскі чакаюць іх у Цэнтральным райсудзе, толькі наадварот: другога будуць судзіць за 26 красавіка, а першага за 1 Мая. Магчыма, што і гэта не вычэрпвае канчатковых прэтэнзій да абодвух падсудзімых: тут, як бачыце, не цяжка і заблытацца. Таму газета ўносіць у справу барацьбы за





парадак і свой унёсак — прапанавай стварыць асобны спецыяльны суд па палітычных матывах, каб вызваліць перагружаныя і без таго тэрытарыяльныя суды для іх сапраўды цяжкай і складанай работы на шчодрай, на жаль, ніве крымінальных і грамадскіх спраў.

Аднак вернемся да нашага суда, які адбыўся ў панядзелак. Увесь час знаходжання ў кабінеце суддзі, дзе і слухалася справа, не пакідала адчуванне нейкай нерэальнасці таго, што адбывалася тут, нейкай ірацыянальнай гульні дарослых людзей. У гэта на працягу гадзіны ці нават больш было ўцягнута па меншай меры 20 чалавек: суддзі, засядацелі, сведкі, прадстаўнікі "привлекаемых", журналісты. Усё было на судзе як на судзе: Ніна Гаўрылюк акуратна знаёміла кожнага з іх правамі ў ходзе пасяджэння, цярпліва расытвала абвінавачваемых і іх сведкаў, задавала пытанні, выслухоўвала іх адказы і тлумачэнні, углядалася ў рэчавыя "доказы", прадстаўленыя міліцыяй і г.д.... І ўсё гэта для таго, каб высветліць тое, што было вядома ўсяму гораду і без суда. А менавіта: **што мітынг 1 Мая быў арганізаваны і праведзены ўладамі і афіцыйнымі прафсаюзамі.** У ім па неад'емнаму праву кожнага грамадзяніна прынялі ўдзел разам са сваімі сябрамі і паплечнікамі і тыя, хто зараз стаяў перад судом(?!).

Над гэтай групай людзей, зусім невялікай адносна астатняга мітынга, луналі бел-чырвона-белыя сцягі, якія **афіцыйна зарэгістраваны** Міністэрствам юстыцыі як сцягі СПБ і БНФ. Над гэтай групай людзей трымалася некалькі плакатаў і транспарантаў, змест якіх **начальству з трыбуны "мясцовага маўзалея" падаўся зневажаючым** іх "честь и достоинство". Гэтая група людзей сваёй **арганізаванай калонай** і пакінула плошчу, як гэта зрабілі **ўсе іншыя**, пасля мітынгу.

Вось і ўвесь крымінал. Але дэкрэт N 5 супраць яго і скіраваны: або будзьце аднадушныя як усе, або не праяўляйце самастойнасці і ўласных думак. Зыск у суд падпісалі, праўда, не самі "зняважаныя" (хутчэй за ўсё, проста самім фактам удзелу ў мітынгу гэтай "неаднадушнай" групы людзей). Яны прадаставілі гэтую "честь" капітану міліцыі Даніліну. Ён, аднак, у суд не з'явіўся, што сталася праз гадзіну ўсіх працэдур і допытаў прычынай пераносу суда на наступны панядзелак.

Сяргей Абадоўскі (справа да В.Цурпанава так і не дайшла) вінаватым сябе не прызнаў, як не прызнае за прававы дакумент і сам дэкрэт N 5. А вось зыск на старшыню гарвыканкама Д.Сівіцкага ён мяркуе падаць за абразу, якую той нанёс "неафіцыйным" дэманстрантам, назваўшы іх у сваёй прамове **"не беларусамі і не славянамі"**. Юрыст С.Абадоўскі бачыць у гэтым, і справядліва, парушэнне афіцыйнай асобай Канстытуцыі, якая не дапускае адзнакі або падзелу людзей па нацыянальнай прыналежнасці. Адначасова ён прасіў суд, калі той прызнае ўсё-такі яго вінаватым за ўдзел у дэманстрацыі, не прызначаць яму штраф, бо плаціць з ягонай зарплаты ў 300 тыс. рублёў пры вялікай сям'і ўсё роўна немагчыма. Падсудныя згодныя адседзець "суткі".

На гэтым пакуль і скончылася справа. Працяг яе ў панядзелак.



P.S. Да гэтага матэрыялу мы дадаем некалькі здымкаў, якія нічым не адрозніваюцца ад тых, што былі прадастаўлены міліцыяй у суд у якасці "вещественных доказательств". Мы друкуем гэтыя фота ў якасці загадкі для чытачоў. Паспрабуйце за гадзіну (час, які спатрэбіўся на першае пасяджэнне суда) знайсці падцверджанні злачынных паводзінаў "свабодных" дэманстрантаў. Для чысціні эксперыменту тлумачым наступнае:

— на трыбуне "маўзалея" начальства, выступае Д.Сівіцкі, злева ад яго старшыня абл-выканкама А.Кулічкоў;

— дэманстранты трымаюць транспарант, на якім напісана: "Куличков! Гитлер и Муссолини тоже признавали только один — свой профсоюз" (справа ў тым, што А.Кулічкоў адмаўляецца весці са свабоднымі прафсаюзамі перамовы аб заключэнні адпаведнага пагаднення, як гэта патрабуе закон. Ён прызнае толькі Федэрацыю прафсаюзаў. У гісторыі гэта ўжо бывала, аб чым і напомніў транспарант);

— калона "неафіцыйных" дэманстрантаў арганізавана вяртаецца з плошчы да месца, адкуль збіралася на мітынг.

Пра што вялася гаворка ў судзе, вы ведаеце. Здымкі бачыце. Прапануем падумаць над нашым заданнем. Вашыя разгадкі-дагадкі мы надрукуем.

Генадзь СУДНІК.

Калі за аб'яднанне з Расіяй ОМОН, гэта сур'ёзна

На гэтым тыдні, якім заканчваецца "всенародное обсуждение" аншлюсу(?) Беларусі, мясцовыя дэмакраты мелі намер прыняць у ім удзел, наладзіўшы пікеты па збору подпісаў "супраць" і збору грашовых сродкаў на дапамогу рускім маці, чые сыны загінулі няведама за што ў Чачэніі. Пікетаў на традыцыйным месцы каля "Прыорбанка" меркавалася правесці тры: з панядзелка па сераду.

Аднак ужо першы з іх, 12 мая, паспеў прастаяць літаральна хвіліны. Па загаду палкоўніка Церахава падраздзяленне ОМОНа ў 17-20 усіх пікетчыкаў затрымала, запіхала ў машыну і даставіла ў Цэнтральны РАУС, дзе іх асобы высвятляў маёр Бурлакоў. Былі затрыманы: В.Цурпанаў, С.Атаманаў, І.Шаруха, А.Федараў, А.Кавалёў, В.Сівуха. Разам з імі затрымалі, але хутка вызвалілі афіцыйных наглядальнікаў Беларускага Хельсінскага Камітэта Н.Рославу, С.Абадоўскага і карэспандэнта ТЫДНЁВІКА Д.Новікава, якому баец ОМОНа перашкодзіў зрабіць фотаздымкі на месцы падзей.

У аўторак трое з затрыманых, якіх міліцыя палічыла арганізатарамі пікету, — В.Цурпанава, А.Федарава і В.Сівуху даставілі ў суд. На момант падпісання газеты ў свет мы, на жаль, не ведаем вынікаў разгляду справы.

...Яшчэ раз мусім падкрэсліць сваю згоду з вызначэннем А.Лукашэнкі "всенародного обсуждения" як нонсенса. Каб ён быў — хоць калі-некалі паслядоўным, то варта было б працягнуць гэтую тэзу да лагічнага канца: саюз з Расіяй — нонсенс... Але паколькі за яго ОМОН, мы вымушаны прызнаць: гэта настолькі сур'ёзна, што меркаваннем народа можна і не цікавіцца. Хаця з другога боку, ОМОН даўно ўжо ў "саюзе" (нават па назве), а ў нас яшчэ ёсць шанец пазбавіцца навалы. І ёсць у краіне сілы, здольныя аказаць ёй супрацiў. Бой няроўны: там — дубінкі, тут — сумленне. Але дух людскі заўсёды мацней за "матэрыяльную" сілу.

Дзяніс НОВІКАЎ.

ВАРШАЎСКІЯ НАТАТКІ

Успаміны пра будучае

Па лініі Беларускай Асацыяцыі Журналістаў нашаму рэдактару тыдзень назад пашанцавала прыняць удзел разам з васьмю калегамі незалежных мінскіх і рэгіянальных выданняў у творчым семінары, што быў наладжаны ў Варшаве Еўрапейскай школай журналістыкі (на здымку). Тры дні прадстаўнікі газет "Наша Ніва", "Народная воля", "Свободные новости", "Имя", "Пагоня" і "Тыднёвік Магілёўскі", радыёстанцыі "Свабода" і незалежнага тэлеканала "48" вывучалі праблемы арганізацыі і існавання лакальнай прэсы. Паколькі пытанне гэта даволі спецыфічнае і прафесійнае, асабліва ва ўмовах беларускай рэчаіснасці, Генадзь Суднік прапануе чытачам свае ўражанні ад прабывання ў Варшаве, апускаючы ў іх тое, што было б цікава толькі прафесіяналам. Такім чынам атрымаліся сціплыя замалёўкі з натуры. Вось яны.



ДАЛІКАТНЫ ЖЭСТ

Па тры-чатыры за дзень гаворкі і дыскусіі са знакамітымі польскімі кіраўнікамі вядучых газет, тэлекаментатарамі, арганізатарамі распаўсюджвання мас-медыя зрабілі час прабывання ў Варшаве насычаным, цікавым і, на жаль, хуткацечным. А нашыя лектары, зусім на лектараў не падобныя, былі вартыя таго, каб з кожным з іх правесці як мага працяглыя сустрэчы. Не так часта, асабліва зараз, даводзіцца нам слухаць людзей свабодных, дасведчаных, адкрытых, інтэлігентных, іранічных, а самае галоўнае — прынцыповых. Не ў нашым, зразумела, савецка-камуністычным сэнсе, калі за прынцыповасць выдаецца якраз адсутнасць прынцыпаў, а ў сэнсе наяўнасці пераканання і вернасці ім. Нашыя "выкладчыкі" падчас ваеннага становішча Ярузельскага працягвалі выконваць свой прафесійны абавязак, за што кожны з іх на працягу дыктатарскага дзесяцігоддзя быў арыштаваны і судзімы не па адным дзесятку (!) разоў. Але не здаліся і не пахіснуліся. Не зарабілі ўзнагарод ці палітычна-дзяржаўных пасадаў, а па-ранейшаму працягваюць здабываць і абвяшчаць праўду, за што іх ізноў не любіць кіраўніцтва. Хаця яно і стала кіраўніцтвам дзякуючы іх цвёрдасці і грамадзянскаму подзвігу.

Усе нашыя лектары гаварылі, зразумела, па-польску. І хаця амаль усе мы іх разумелі і так, для нас на семінар быў запрошаны перакладчык. Гаспадары зрабілі гэты далікатны жэст, як нам падалося, у знак павагі і ветлівасці да гасцей. Нашы суразмоўцы, канешне, ведалі "пасрэдніцкую" мову былога сацыялістычнага лагеру — рускую, але яны ўжо прайшлі свой пакутны шлях нацыянальнага адыходу ад камуністычнай імперыі, таму разумеюць і паважаюць імкненне беларускага народа да незалежнасці. І, відаць, не хацелі ставіць нас у няёмкае становішча, з пункту гледжання міжнародных, дыпламатычных і маральных правілаў. На нас гэта зрабіла ўражанне, якое прымушае чалавека адчуць сваю значнасць і годнасць, высока трымаць галаву і выправіць спіну. Паўсюдна — ў гатэлі, кавярнях, крамах і проста на вуліцах наша беларуская гаворка выклікала відавочныя павагу і спагаду... Як балюча бывала пры ўспамінах на рэальную "моўную сітуацыю" у нашай, нібыта двюхмоўнай краіне. І такім ясным станавілася папярэджанне патрыётаў — лепшых людзей Бацькаўшчыны: захоўвайце мову, без яе не будзе ў нас вольнай дзяржавы.

ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

Сканчэнне Другой сусветнай вайны Польшча, як і ўвесь заходні свет, адначае 8 мая. Менавіта ў гэты дзень у 1945 годзе фашысцкая Германія падпісала Акт аб капітуляцыі... У Варшаве мы не заўважылі ніякага "святочнага" афармлення гэтага дня. Вядома, не было ніякай узнёсласці і ваеннага рамантызму з нагоды ахвяраў, стратаў і пакутаў, характэрных для нашай прапаганды, якая выдае гэты дзіўны пафас за народную традыцыю. Для палякаў, якія аднымі з першых у Еўропе зведалі на сябе жахі вайны (не без "братняй дапамогі" сталінскага рэжыму), гэты дзень азначае гора, смутак і памяць, з якімі па-чалавечы не дапасуюцца парады ды шэсці, ваенныя маршы з усіх рэпрадуктараў і казённыя цырымоніі ўскладання прляндаў і вянкоў. Пад усімі мемарыяльнымі ваеннымі дошкамі і ля падножкаў усіх ваенных помнікаў варшавяне самі зранку запалілі свечы, перавязаныя нацыянальнымі лентамі і ўвесь дзень не па графіку, а па ўласнай магчымасці прыпыняліся ля мемарыяльных знакаў вайны, ускладалі новыя кветкі і запальвалі новыя свечкі. Было відавочна, што палякі не дазваляюць нікому выкарыстоўваць гэты святы дзень у сваіх палітычных і прапагандысцкіх мэтах. Гэты дзень святы для іх не па вызначэнні ці абавязку, а па настрою, шчырасці і смутку.

На нейкай вуліцы каля мемарыяльнай дошкі пры запаленых свечах моўчкі пастаялі хвілінку і мы. А вечарам у гатэлі пасля звыклага прагляду праграмы "Время" па ОРТ (першы расійскі канал трансліруецца ў Польшчы), не згаворваючыся, павыключалі свае тэлевізары, дзе пачынаўся чарговы ваенны фільм з Масквы, і прыбіліся да свайго "штабнога" пакоя, дзе і выпілі разам амаль без слоў па чарцы за перамогу. Ціха, ледзь не шэптам праспявалі адзін куплет "Темной ночи", і разышліся кожны са сваімі думкамі... Не ведаю, што думалася маім калегам. Пра сябе магу сказаць: на душы было адначасова святочна і самотна, журботна і светла. Даўно не перажываў такога настрою менавіта ў гэты пераможны Дзень. А можа ніколі раней яго і не бывала...

МІТЫНГ БЯЗДОМНЫХ

У дзень ад'езда накіраваўся да Старога Мяста, знакамітага куточку колішняй Варшавы, удала прыстасаванага цяпер для шматлікіх турыстаў. Тут прынята развітвацца з Польшчай. А шлях да вакзалу пралягаў міма прэзідэнцкага Палацу. Здалёк заўважыў натоўп людзей і сцягі, падобныя на нацыянальныя беларускія.

З цікавасцю і рызыкай спазніцца на цягнік далучыўся да мітынгу ў самым цэнтры сталіцы. То былі бяздомныя людзі, пераважна мужчыны, дрэнна апранутыя і няголеныя. Яны прыйшлі да Палаца калонай пад польскімі сцягамі і пад "аховай" не болей, чым трох паліцэйскіх легкавушак, якія наперадзе сваімі сірэнамі і гучнымі аб'явамі па мегафонах выслабанялі дэманстрантам дарогу. Удзельнікі шэсця раздавалі сваю ўлётку — зварот да прэзідэнта, у якім першымі словамі былі: "Мы патрабуем..." На першым пасту перад Палацам не дабавілася ніводнага да звычайных там пяці-шасці ахоўнікаў у ваеннай форме і двух паліцыянтаў. Адзін з афіцэраў прыняў ад "старшага" на мітынгу петыцыю і хуткім крокам, ледзь не бягом, накіраваўся ў Палац. Хутка адтуль разам з ім выйшаў чалавек у цывільным, да якога адразу ж праз невысокі дэкаратыўны паркан, што аддзяляе тратуар ад прылягаючага да Палаца газону, паскочылі і пабеглі тэле- і фота- журналісты. За імі не варухнуўся ніводзін з ахоўнікаў або паліцыянтаў. Чалавек падыйшоў да мітынгоўшчыкаў і пачаў з імі гаворку... Адны варшавяне спыняліся на хвілінку ці болей каля людскога натоўпу, тым больш, што абыходзіць яго даводзілася па праезжай частцы, дзе паліцыянты жэзламі паказвалі дарогу. Іншыя спяшаліся міма, нават не павярнуўшы галавы... Да іх далучыўся хутка і я — цягнік не стаў бы мяне чакаць.

P.S. Ледзь не забыўся паведаміць яшчэ пра адзін эпізод, да якога ўсе мы праявілі цікавасць. На адным з будынкаў непадалёк ад Варшаўскага універсітэту (гэта цэнтр сталіцы) вялікімі літарамі каляровай фарбай быў напісаны заклік супраць уступлення Польшчы ў НАТО, што, як вядома, супярэчыць афіцыйна абвешчанаму ў дзяржаве курсу. Нас гэты заклік сустрэў, з ім мы і паехалі. Ніхто яго не запэцкаў і не зафарбаваў. Можа таму, што напісаны ён быў прыгожымі каляровымі літарамі, аздоблены нейкім сімвалічным малюнкам — і выглядала гэта добра, нічым не горш за вялізныя "афіцыйныя" плакаты за ўступленне ў НАТО...

І самае апошняе. Пабывалі мы ў краіне, якая ўявілася нам нашай будучыняй, дзе людзі жывуць заможна і ў добрым настроі, вольна і прыгожа. Зразумела, з праблемамі. Зразумела, з унутранай барацьбой паміж палітыкамі. Зразумела, з незадаволенымі і нават, як бачым, з бяздомнымі. З талерантнай апазіцыяй у Сейме і радыкальнай "Салідарнасцю" на прадпрыемствах. Зразумела, са злачыннасцю і цяжкасцямі эканамічных рэформаў... Словам, як нармальная краіна, якая ведае, што воля і дэмакратыя — гэта найцяжэйшая сістэма супольнага грамадскага існавання. Лепш за якую, аднак, чалавецтва пакуль не прыдумала.

Генадзь СУДНІК.

Захаваем ці парвём нітачку незалежнасці?

У афіцыйнай беларускай журналістыцы няма інфармацыйнасці, а ёсць прапаганда і агітацыя. Надта часта, асабліва ў "тонкіх" пытаннях палітыкі, грамадскасці прадастаўляюць і прапануюць на суд не ФАКТ або ЛІЧБУ, не ДУМКУ або ЦЫТАТУ, а іх пераказ (у лепшым выпадку) і сваё тлумачэнне (часцей за ўсё).

Так сталася і з апошнім дакументам лідэра нацыянальнай апазіцыі Зянона Пазьняка — "Дэкляацыяй". Са спасылкай на яе не толькі афіцыйная прэса, а і прэзідэнт узнялі вэрхал наконт "заклікаў палітычнага эмігранта да зброі..." Вось гэты дакумент.

...Наша нацыя ў небяспецы, бо людзі, што захапілі ўладу і кіруюць Беларусяй, зьнішчаюць яе. Людзі, што захапілі ўладу, вядуць чужынцаў на нашу зямлю, сквапных і жорсткіх. Расейскія імпэрыялісты, пацярпеўшы паразу ў чачэнскай вайне, аб'явілі, што возьмуць рэванш у Беларусі.

Але яны памыляюцца. На Беларусі ёсьць каму яе абараняць; ёсьць каму змагацца за беларускую волю, свабоду і незалежнасьць.

У дзень Чарнобыльскай нацыянальнай трагедыі, ва ўмовах нацыянальнай здрады, прадажнасьці і ашуканства, Беларускі Народны Фронт, які 9 гадоў таму падняў пытаньне аб кампенсацыі і пакараньні за чарнобыльскі генацыд, які ахвярна змагаецца з прафашысцкім акупацыйным рэжымам, бярэ цяпер на сябе адказнасьць за будучыню беларускай нацыі, за будучыню вольнай Беларусі.

Я, Зянон Пазьняк, старшыня Беларускага Народнага Фронту, ва ўмовах здрады прэзідэнта і кіраўніцтва Беларусі, ва ўмовах страты беларускай дзяржавы, ускладаю на сябе адказнасьць гаранта незалежнасьці Беларусі, пакуль ёсьць прафашысцкі рэжым і небясьпека існаваньня беларускай нацыі. Пастанаўляю змагацца за волю і незалежнасьць Беларусі да пары, пакуль не ліквідуем пагрозы і не здабудзем свабоды.

Беларускі Народны Фронт будзе праводзіць альтэрнатыўную палітыку і аднаўляць альтэрнатыўную рэжыму Лукашэнкі незалежную, вольную Беларусь.

Заклікаю людзей да супраціўленьня расейскай акупацыі. Заклікаю да супраціўленьня прафашысцкаму рэжыму на Беларусі. Заклікаю да грамадзянскага непадпарадкаваньня бясправўнай уладзе, да невыкананьня яе бясправўных указаў, дэкрэтаў і распараджэньняў. Чым больш людзей разам будзе адкрыта пратэставаць супраць дыктатуры і патрабаваць вольнай Беларусі, тым хутчэй абваліцца бясправўны рэжым.

— Мы павінны патрабаваць ад Заходу і Злучаных Штатаў Амерыкі спыніць усялякую фінансавую дапамогу імпэрскай Расеі, якая праводзіць аншлюс Беларусі.

— Прапаную аб'явіць справўцаў лістападаўскага антыканстытуцыйнага перавароту Чарнамырдзіна, Строева і Селязьнёва пэрсонамі нон грата на Беларусі.

— Прапаную патрабаваць ад Лукашэнкі дабраахвотна адмовіцца ад пасады прэзідэнта і пайсьці пад суд Рэспублікі Беларусь.

— Лічу неабходным скіраваць беларускае грамадства на падрыхтоўку арышту Лукашэнкі і аднаўленьня законнасьці ў краіне.

Жыве Беларусь!

Зянон Пазьняк,
Старшыня Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне".
26 красавіка 1997 г. Кіеў-Менск.

"Патрыёты Бацькаўшчыны" — хто мы?

Арганізацыя моладзі, якая мае назву "Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу" была створана летам 1996 года. Некалькі маладых магілёўцаў вырашылі аб'яднаць свае намаганні і нейкім чынам зварухнуць на нацыянальна-патрыятычнай глебе частку моладзі. Спачатку хлопцаў прывабіла ідэя менскага "Белага легіёну", але, з цягам часу, задачы арганізацыі сталі шырэйшымі, а яе праца трывала замацавалася на дэмакратычных колах. Аднагалосна быў абраны лідэр — Валадар Цурпанаў, які быў старэйшым за іншых і меў досвед як у працоўнай, так і ў палітычнай дзейнасці.

"Патрыёты" бралі ўдзел у мітынгах і масавых шэсцях, якія праходзілі ў Менску. У Магілёве часта падзілі пікеты, у тым ліку — у падтрымку зняволенага паэта Славаміра Адамовіча, супраць фашызму ды іншыя. Разам з дэмакратычнымі сіламі горада праводзілі апошнія акцыі з нагоды Дня Канстытуцыі, Чарнобыльскай трагедыі, 1 мая. Шэрагі "Патрыётаў" пастаянна папаўняюцца. Галоўныя прыярытэты арганізацыі — Радзіма, Мова, Незалежнасць (а таксама такія чалавечыя якасці, як самаадданасць, годнасць і адказнасць).

Нягледзячы на запужванне з боку ўладаў, гэтыя хлопцы і дзяўчаты адкрыта ідуць насустрач сваёй будучыні. Ім не абыякавы свой далейшы лёс і лёс Бацькаўшчыны, бо яны імкнуцца стаць эўрапейскай моладдзю ў свабоднай дэмакратычнай Беларусі.

P.S. Падчас перавыбараў старшыні Магілёўскай філіі БНФ якраз В.Цурпанава і абралі старшынёй. А новым кіраўніком маладзёвай арганізацыі стаў Алесь Асіпцоў.

Усіх жадаючых быць сябрамі "ПБРЭ" чакаем кожны чацвер з 18.00 па адрасу: г. Магілёў, вул. Ленінская, 27. Тэлефоны: 25-49-62 (па аўторках з 21-й да 22-й гадзіны) і 22-54-19 (па аўторках і чацвяргах з 18-й да 20-й гадзіны).

Алесь ТАБОЛІЧ.

* * *

6 мая, на Радаўніцу, члены маладзёжнага згуртавання "Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу" ушанавалі памяць продкаў, наведаўшы месцы, дзе ўстаноўлены сімвалічныя Крыжы.

Усяго ў Магілёве чатыры такія Крыжы: першы — ахвярам сталінскіх рэпрэсій, другі — паэту Цішку Гартнаму. А вось два апошнія ўжо не існуюць — гэта Крыжы, якія павінны былі стаяць у памяць ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы. Як паведамляла наша газета, адзін з іх зламалі, а другі — скралі.

Тым не менш, маладыя патрыёты ўсклалі вяночкі каля таго месца, дзе ўжо няма Крыжа, каб яшчэ раз нагадаць людзям пра варварскія адносіны ўладаў да памяці чарнобыльскіх ахвяраў. Адразу пасля таго, як скончылася традыцыйная ў такіх выпадках хвіліна маўчання, да моладзі пачалі падыходзіць людзі і цікавіцца тым, што тут адбываецца. Калі да іх давялі, з якой нагоды "помнік", некаторыя пакінулі там чырвоныя яйкі, прыгатаваныя да свайго стала, другія проста паспачувалі. Наогул, склалася ўражанне, што не ўсім жыхарам абыякавы лёс нашага горада.

Дзяніс НОВІКАЎ.



Диктатура: хроника местных событий и фактов

Продолжение. Начало в N7

Бобруйск, 1996 г.

6 февраля. Горисполком незаконно отказал председателю Бобруйского клуба избирателей В.С.Куртукову в организации встречи с депутатами ВС С.А.Богданкевичем, В.И.Гончаром, А.О.Добровольским.

18 апреля. Горисполком незаконно отказал председателю городской организации ОГП В.С.Куртукову в организации встречи с прокурорами города.

24 апреля. Горисполком незаконно отказал председателю Бобруйской филии БСДГ Н.М.Веринскому в проведении митинга, посвященного Дню 1 мая.

18 июля. Горисполком незаконно отказал председателю клуба избирателей В.С.Куртукову в организации митинга в поддержку кандидата в президенты РФ Ельцина.

22 июля. Горисполком незаконно отказал председателю городской организации БНФ В.Свизунову в организации митинга, посвященного Дню независимости.

1997 г.

18 марта. Бобруйский горисполком незаконно отказал председателю городской организации БНФ В.Свизунову и председателю городской организации ОГП В.С.Куртукову в проведении митинга, посвященного 79-й годовщине провозглашения БНР.

Могилев, 1997 г.

7 февраля. Председатель Могилевской городской организации БНФ В.И.Цурпанов был оштрафован судом Центрального района (судья Гуринович Л.Г.) на 650 тыс.руб. за "неповиновение работникам милиции".

25 февраля. Административная комиссия Центрального района (председатель Кистенева А.Ф.) оштрафовала В.И.Цурпанова на 300 тыс.руб. за "пользование в общественном месте флагом (бело-красно-белым), незарегистрированным в установленном порядке" и на 130 тыс.руб. "за проживание не по месту прописки".

10 марта. Могилевский горисполком незаконно отказал городскому клубу избирателей в проведении шествия и митинга, посвященного Дню Конституции.

13 марта. Решением суда Центрального района (судья Маймусов С.С.) за расклеивание листовок был арестован на трое суток инженер Института прикладной оптики А.П.Ильяшенко, а председатель Могилевского клуба избирателей В.И.Сивуха был оштрафован на 2 млн. 600 тыс.руб.

Еще 17 июля 1996 г. Могилевский облисполком (председатель Куличков А.Н.) отказался вести переговоры с Советом Могилевской региональной организации Свободного профсоюза о заключении Соглашения между Свободным профсоюзом, облисполкомом и Могилевской ассоциацией промышленников и предпринимателей (МАПП), что явилось грубым нарушением законов РБ "О коллективных договорах" и "О профессиональных союзах". После многочисленных безуспешных попыток с помощью прокуратуры принудить облисполком выполнить закон, областная организация Свободного профсоюза начала периодическое пикетирование облисполкома. Режим ответил репрессиями.

4 марта судом Ленинского района (судья Гладкий Н.Н.) за "несанкционированное пикетирование" оштрафован на 650 тыс.руб. председатель городской организации Свободного профсоюза С.В.Ободовский. **26 марта** тот же судья Гладкий Н.Н. оштрафовал за "несанкционированное пикетирование" на 260 тыс.руб. безработного М.М.Шераметова и частного предпринимателя С.Б.Амбружевича.

25 марта. Суд Центрального района (судья Гуринович Л.Г.) незаконно оштрафовал председателя городской организации БСДП "Народная громада" В.П.Лапцевича на 2 млн.600 тыс.руб. за"участие в несанкционированном шествии".

25 марта. Минский городской суд незаконно подверг административеному аресту сроком на 15 суток электрослесаря Межисетской птицефабрики Г.П.Орешкова за "неповиновение и сопротивление органам милиции".

26 марта. Суд Фрунзенского района г.Минска (судья Мисуно С.Э.) незаконно подверг административному аресту на 3 суток В.И.Цурпанова за "участие в несанкционированном собрании".

8 апреля. Административная комиссия Центрального района (председатель Кистенева А.Ф.) незаконно оштрафовала В.П.Лапцевича на 390 тыс.руб. за распространение листовок.

15 апреля. Суд Центрального района (судья Гуринович Л.Г.) незаконно оштрафовал В.И.Цурпанова на 3 млн.руб. за "подготовку и организацию несанкционированного шествия".

17 апреля. Горисполком незаконно отказал городской организации БНФ в проведении антифашистского пикета.

21 апреля. Горисполком незаконно отказал областной организации БНФ в проведении шествия "Чарнобыльскі Шлях".

22 апреля. Горисполком незаконно отказал могилевскому комитету "Дети Чернобыля" в установке мемориального креста в память о жертвах атомной катастрофы.

Юрась ПІВУНОЎ:

"А ўсяго і трэба — годна жыць!"



* * *

За небакрай сплывае сонца,
Зьмярканьне просіцца у горад,
На небе сьціплы абаронца
Людской Душы —
хлапчына-Месяц
Глядзіць з вышыняў недасяжных
На мітусьню, штодзённы клопат,
Ў людзей жа шмат прычынаў
розных —
Іх позірк прыкаваны долу,
А будні шэрыя зьядаюць
Жыцьця чароўныя імгненьні,
Куды ні глянеш — ўсюды бачыш
Адны нікчэмныя памкненьні...

* * *

Абсыпалася цэгла
Замкавых муроў.
Згубіў нашчадак годнасьць
Продкаў-ваяроў.
Па месьце старажытным
Вецер гоніць пыл.
Гарыць у небе зорка,
Назва ёй — Палын.

* * *

Сінеча нябёсаў,
І вецер паўночны,
Сады зацьвітаюць,
І ранкам марозна.
У сад пракаветны
Ступаю нясьмела,
Між дрэў там блукае
Чароўная фея.
Дзяўчына у лёгкім,
Сьвяточным убраньні,
Імя ёй — Венера,
Багіня Каханьня...

Максіму Багдановічу

Ўжо так здараецца
Ў жыцьці у нашым часта,
Што лепшыя сыходзяць
У нябыт, у цемру першымі...
Бывае толькі-толькі пачынае
Дарунак Божы —
талент —расьцьвітаць,
Як раптам... сьмерць
Й сьцюдзёны жвір магільны...
Што застаецца? —
Творы, кнігі, словы...

* * *

Крадзецца вечаровы змрок
ў пакой —
І нараджае сьветлаценi,
А недзе побач грукаціць
Па шляху рэйкавым цягнік
І зьнікае бязь сьледу,
і сплывае удалеч
Мітусьлівае быцьцё чалавека-
мураша...
Зьнікаюць дробязі жыцьця
І цемра патыхае Вечнасьцю...

* * *

"Бывают дни,
Когда опустишь руки.
И нет ни слов,
Ни музыки, ни сил..."

Спакою не знайсьці
Душы збалелай,
Чорнай паласой
Ідзе жыцьцё,
Хоць, каму цікавае Паэта
Ціхае, сьлязьлівае ныцьцё?
Бо лягчэй за ўсё —
Паддацца лёсу,
Не змагацца
Й не спрабуючы зьмяніць
Ўяўную фатальнасьць
Існаваньня...
А ўсяго і трэба —
Годна Жыць!

Беражыце нашую мову

У красавіку ў Мінску адбыўся з'езд Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны. Наш карэспандэнт перадае свае ўражанні ад атмасферы з'езда і знаёміць чытачоў з яго асноўным дакументам.

З'езд праходзіў пад лозунгам (у прамым і пераносным сэнсе) — "Спыніць русіфікацыю Беларусі!" Вядома, што мова народу любой краіны — найпершая абарона ад каланізацыі, асіміляцыі і гістарычнага знішчэння. Беларусі, як суб'екта гісторыі, як самастойнай краіны і яе народа, як носьбіта адметнай культуры даўно не існавала б, каб не родная мова. Гэта разумеюць не толькі патрыёты Бацькаўшчыны, але і яе здраднікі. За непрацяглы час прэзідэнцтва А.Лукашэнкі рэзка зменшылася колькасць беларускамоўных школ і класаў, амаль усе газеты (нават дзяржаўныя) перайшлі на рускую мову. Людзям, што гавораць у сябе дома на матчынай мове, дастаюцца не толькі здзеклівыя ўсмешкі недавумкаў, але нярэдка — і дубінкі омоновцев.

Улада лагодна і абыякава ставіцца да таго, што беларуская мова знікае са службовага і бытавога ўжывання, з шыльдаў і назваў, аб'яў і афіцыйных абвешчанняў. Знакамітая магілёўская вада, напрыклад, не "...крыніца", а "...родник", наш фестываль не "музычная вясна", а "музыкальная" і г.д. А якія песні гучаць з шапікаў, дзе гандлююць касетамі, якія кнігі ляжаць на шматлікіх прылаўках, на якой мове гавораць у службовы час пры афіцыйных мерапрыемствах нашыя афіцыйныя асобы?.. У душы яны, відаць, лічаць сябе беларусамі і, каб падтрымліваць такую ілюзію, кожнае мясцовае свята аздабляюць "нацыянальнымі" канцэртамі, не разумеючы, што штучна-казённае стаўленне да нацыянальных культуры, музыкі, наогул традыцый яшчэ больш прыніжаюць іх...

Мову нельга забіць, не забіўшы чалавека. Калісьці наш усходні сусед так і рабіў. Цяпер ён стаў больш "цывілізаваным" і забівае нас духоўна. Крыўдна і балюча, што абапіраецца ён у гэтай бруднай справе на ўнутраных здраднікаў, якія азвотна і бяздумна праводзяць варварскую палітыку, каб зарабіць сабе дзікунскі, прынёсшы незлічоныя беды многім народам свету, тытул "інтэрнацыяналістаў"...

А.ТАБОЛІЧ.

ЗВАРОТ

У З'езда Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны да моладзі Беларусі

Дарагія сябры!

Падобна да таго, што ў блізэйшым часе нам давядзецца жыць і працаваць ва ўмовах акупацыйнага рэжыму, які па сутнасці ўжо ўсталяваўся і цяпер спрабуе ўзаконіцца.

Мы заклікаем вас усвядоміць адказнасць за лёс нашай мовы і лёс Бацькаўшчыны. У значнай ступені ад вас залежыць, у якой краіне вы і вашыя дзеці будзеце жыць у наступным стагоддзі — у вольнай і багатай Беларусі ці ў расейскай калоніі, дзе нашая мова, усе нашыя святыні будуць затаптаныя і апляваныя.

На жаль, многія нашы грамадзяне, асаблівa старэйшага пакалення, выхаваныя на прывідных каштоўнасцях і ідэях, не ў стане зразумець, што яны трацяць, выракаючыся роднае мовы, не ў стане зразумець, што родная мова поруч з гістарычнай свядомасцю — гэта падмурак незалежнасці дзяржавы, без якой у гэтым свеце немагчымы дабрабыт народа.

Каб выстаяць і перамагчы ў цяжкім змаганні з імперыяй, трэба і мужнасць, і веды, і падтрымка папечнікаў. Гуртуйцеся ў супольні Таварыства беларускае мовы! Калі мы будзем разам, нас не адужаюць ніякія каланізатары!



Наколькі вы талерантныя?

ТЭСТ

Ці дапускаеце вы існаванне думкі, якая адрозніваецца ад вашай? Ці адносіцеся вы да яе з павагай? Перад вамі тэст, які, спадзяёмся, хоць прыблізна дапаможа вызначыць ступень вашай талерантнасці. Але адна ўмова: адказвайце хутка, не раздумваючы.

1. Ці непрыемная для вас сітуацыя, калі даводзіцца адмаўляцца ад плана, які вы прыдумалі, таму што якраз такі ж план прапанавалі вашы сябры?

а) так; б) не.

2. Вы сустракаецеся з сябрамі і нехта прапаноўвае пачаць гульню. Чаму вы аддадзіце перавагу?

а) таму, каб удзельнічалі толькі тыя, хто добра гуляе;

б) таму, каб гулялі і тыя, хто яшчэ не ведае правілаў.

3. Вы спакойна ўспрымаеце непрыемныя для вас навіны?

а) так; б) не.

4. Ці выклікаюць у вас непрыязнасць людзі, якія ў грамадскіх месцах з'яўляюцца ў нецвярозым стане?

а) калі яны не пераступаюць дапушчальных межаў, вас гэта наогул не цікавіць;

б) вам заўсёды былі непрыемныя тыя людзі, якія не ўмеюць сябе кантраляваць

5. Ці можаце вы лёгка знайсці кантакт з людзьмі іншых прафесій, становішчаў, звычаяў?

а) вам вельмі цяжка гэта зрабіць;

б) вы не звяртаеце ўвагі на такія рэчы.

6. Як вы рэагуеце на жарт, аб'ектам якога робіцеся?

а) вам не падабаюцца ні жарты, ні жартаўнікі;

б) калі нават жарт і будзе вам непрыемны, вы пастараецеся адказаць у такой жа жартаўлівай форме.

7. Ці згодны вы з меркаваннем, што шмат людзей "сядзяць не на сваіх месцах", "робяць не сваю справу"?

а) так; б) не.

8. Вы прыводзіце ў кампанію сябра (сяброўку), які(якая) становіцца аб'ектам усеагульнай увагі. Як вы на гэта рэагуеце?

а) вам непрыемна, што такім чынам увага адцягнута ад вас;

б) вы толькі радуецеся за яго(яе).

9. У гасцях вы сустракаеце чалавека ў гадах, які крытыкуе сучаснае пакаленне, расхвальвае былыя часіны. Як рэагуеце вы?

а) ідзяце раней дадому (пад выдуманай прычынай);

б) уступаеце ў спрэчку.

А зараз падлічыце балы. Запішыце па два балы за адказы: 1-б, 2-б, 3-б, 4-а, 5-б, 6-б, 7-б, 8-б, 9-а.

0-4 балы: вы нязломны і, прабачце, упарты. Дзе б вы не знаходзіліся, можа ўзнікнуць такое ўяўленне, быццам вы імкнецеся навязаць сваю думку іншым; каб дасягнуць сваёй мэты, часта павышаеце голас. З вашым характарам цяжка трымаць нармальныя адносіны з людзьмі, якія думаюць інакш, не пагаджаюцца з тым, што вы гаворыце і робіце.


6-12 балаў: вы здольны цвёрда адстаяць свае перакананні. Але вы, бясспрэчна, здольны і весці дыялог; калі лічыце патрэбным — можаце свае перакананні мяняць. Часам вы здольны, аднак, і на залішнюю рэзкасць, непавагу да суразмоўцы, — такім чынам вы выйграеце спрэчку з чалавекам, у якога слабейшы за ваш характар. Але ці варта "браць горлам", калі можна перамагчы больш годна?

14-18 балаў: цвёрдасць вашых перакананняў выдатна спалучаецца з вялікай тонкасцю, гібкасцю вашага розуму. Вы можаце прыняць любую ідэю, з разуменнем аднесціся да парадаксальнага, на першы погляд, учынку, нават калі вы іх не раздзяляеце. Вы даволі крытычна ставіцеся да сваёй думкі і здольны з павагай і тактам у адносінах да суразмоўцы адмовіцца ад поглядаў, якія, як высветлілася, былі памылковымі.

Пераклаў з польскай Ю.ДЗЕГЦЯРОЎ.

18 МАЯ — СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ МУЗЕЯЎ

Добраахвотныя памочнікі музеяў



Згодна статыстыкі ЮНЕСКА ў апошнія гады назіраецца хуткі рост наведвальнікаў музеяў у розных краінах свету. Адна з прычын гэтага — узросшая зацікаўленасць людзей гісторыяй, сваёй мінуўшчынай, здабыткамі і майстэрствам пакаленняў. Другая — імкненне пазнаць свет, што прывяло да росквіту міжнароднага турызму, які для часткі краін з'яўляецца асноўнай крыніцай валютных паступленняў. Без музеяў, якія прадстаўляюць людзям шмат якасных паслуг, працуюць на высокім прафесійным узроўні, немагчыма ўявіць пазнанне як мінулага, так і сучаснасці. Вялікую дапамогу супрацоўнікам музеяў аказваюць добраахвотныя памочнікі, якія аб'яднаны ў таварыствы сяброў музеяў.

У чэрвені 1972 года адбыўся першы міжнародны кангрэс таварыстваў сяброў музеяў у Барселоне. На ім было 150 чалавек. А ўжо ў 1992 годзе ў свеце налічвалася болей 650 тысяч сяброў музеяў.

Сусветная практыка сведчыць аб тым, што сябры музеяў адыгрываюць значную ролю ў стварэнні неабходных сувязяў паміж музейнымі ўстановамі і грамадствам. Яны займаюцца прапагандай музейных калекцый, абслугоўваюць публіку, збіраюць фінансавыя сродкі.

Сённяшняя дзейнасць сяброў музеяў падзяляецца на тры катэгорыі: 1) дзейнасць, якая робіцца ад імя музеяў, — накіраваная на забеспячэнне фінансавай падтрымкі шляхам збору сродкаў для набыцця і рэстаўрацыі экспанатаў; 2) асветніцкая праца сярод шырокага кола наведвальнікаў, навучэнцаў школ, арганізацыя творчых майстэрняў для дзяцей і г.д.; 3) дзейнасць на карысць больш глыбокага ўсведамлення публікай і органамі ўлады праблем, звязаных з мастацкай спадчынай (праводзіцца праз друк, тэлебачанне, відэа і г.д.)

Сябры музеяў розных краін аб'ядналіся ў адну арганізацыю: Сусветную федэрацыю сяброў музеяў (СФСМ). У 1989 г. ЮНЕСКА надала СФСМ статус міжнароднай няўрадавай арганізацыі катэгорыі "С". Зараз у яе складзе 15 сапраўдных (нацыянальных федэрацый) і 14 асацыятыўных членаў. Побач з калектыўным сяброўствам прысутнічае і асабістае. Назіраецца тэндэнцыя да павелічэння падобных таварыстваў.

Вывучаючы і аналізуючы дзейнасць СФСМ, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ва ўмовах суверэнітэту нашай Бацькаўшчыны існуе вострая неабходнасць у стварэнні Нацыянальнай федэрацыі сяброў музеяў Рэспублікі Беларусь. Аб гэтым я ўжо пісаў у 1993 годзе. Але прапанова, на жаль, засталася на паперы. А ў прынцыпе, нават на прыкладзе нашага горада, было і ёсць каму закласці падмурак такой федэрацыі. Гэта і фонд адраджэння культурнай спадчыны Магілёва (старшыня Н.Рослава), які праявіў сябе як сталы і даволі моцны мецэнат, зрабіўшы каштоўныя падарункі твораў мастацтва і этнаграфіі музею гісторыі Магілёва, а таксама як актыўны прапагандыст гісторыі роднага краю; гэта і шэраг магілёўцаў, якія да нядаўняга часу гуртаваліся вакол грамадскага фонда "Музей Магілёва". Нягледзячы на знікненне фонда, яго сябры самааханна дапамагаюць музею гісторыі Магілёва.

Шчырае дзякуй сябрам музея, зрабіўшым шмат карыснага для захавання спадчыны нашага горада: У.Гвоздзеву, В.Васількову, С.Глазштэйну, Я.Рыеру, А.Агееву, А.Фёдараву, Я.Клімуцю, Э.Мядзведскаму, Н.Рославай, Л.Сапоўкінай (Расія), Ю.Васілеўскаму (ЗША), В.Кіпелю (ЗША), В.Юдзіну, І.Марзалюку, В.Глінніку (Мінск) і інш.

Пераймаючы вопыт працы сяброў музеяў Італіі, Канады, Францыі, ЗША, маючы такую славутую і багатую на падзеі гісторыю, здабыткі мастацтва, музейшчыкі і іх сябры здольныя стварыць шыкоўную музейную сетку, якая прываблівала турыстаў і навукоўцаў да нас у Беларусь. Дзякуючы гэтаму шмат людзей з усяго свету даведаюцца аб вялікім укладзе беларускага народу ў развіццё агульначалавечай культуры.

Ігар ПУШКІН,
дырэктар музея гісторыі Магілёва.

***НА ЗДЫМКУ:** фрагмент экспазіцыі аднаго з расійскіх музеяў, створанага пры дапамозе сяброў музея.*

МАГІЛЁЎ: ДАЎНІНА І СУЧАСНАСЦЬ

На будучым тыдні Магілёў святкуе сваё 730-годдзе. Набліжэнне свята супала з пачаткам публікацыі ў нашай газеце гістарычнай работы І.Пушкіна "Магілёў у пытаннях і адказах". Разам з краязнаўцам мы перагорнем найбольш значныя старонкі шматвекавой біяграфіі роднага горада, што яшчэ раз дапаможа нам зразумець і пераканацца: жыццё горада, краіны і народа пачалося зусім не з 1917 года... А нішто іншае, як разуменне непарыўнасці гісторыі і адказнасці кожнага пакалення за сваю "частку жыцця", і робіць чалавека прыстойным і свядомым.

Сёння першая публікацыя цыклу "Магілёў у пытаннях і адказах".

Без ведання гісторыі няма свядомага чалавека

КАЛІ БЫЛА ЎТВОРАНА МАГІЛЁЎСКАЯ ПРАВАСЛАЎНАЯ ЕПАРХІЯ?

Акт ("Стацці") аб утварэнні асобнай праваслаўнай епархіі на тэрыторыі Магілёўшчыны быў прыняты 1 лістапада 1632 года і ў той жа дзень быў занесены ў актавыя кнігі г.Варшавы. Зацверджаны прывілеем караля Уладзіслава IV на каранацыйным сойме 14 сакавіка 1633 года. Епіскапы зваліся: "епіскап Мсціслаўскі, Неуніт, Аршанскі і Магілёўскі". Напачатку Магілёўская епархія не вылучалася са складу Полацкай, а з'яўлялася яе складовай часткай. Па каралеўскаму прывілею не былі дакладна акрэслены і яе межы. Епіскапы павінны былі жыць у Магілёўскім Спаскім манастыры. Акрамя Спаскай царквы ў Магілёве ім перадаваліся яшчэ чатыры царквы ў Магілёве, дзве царквы ў Оршы, адна ў "Дзісне", адна ў Полацку, а таксама Троіцкая і Спаская цэрквы ў Мсціславе. Першым епіскапам стаў 15 лістапада 1632 года былы настаяцель Віленскага Свята-Духава манастыра Ігумен Іосіф Бабрыковіч-Капет-Анехожскі. У сувязі з тым, што Спаскі манастыр у Магілёве на той час належаў уніятам, рэзідэнцыя епіскапаў была ў Крыжаўздвіжанскай царкве да 1650 года.

Па прывілею караля Яна III Сабескага (1675 г.) да тытулу магілёўскіх епіскапаў дабаўлена "І Беларускі". З таго часу магілёўская епархія яшчэ стала звацца Беларускай.

У 1883 годзе ў епархіі быў утвораны першы царкоўны друкаваны орган —часопіс "Магілёўскія епархіяльныя ведамасці". Праіснаваў да 1917 г. Першым рэдактарам быў выкладчык Магілёўскай духоўнай семінарыі, магістр багаслоўя Д.І.Ціхаміраў.

ЯКІМ БЫЛО СТАНОВІШЧА МАГІЛЁЎСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЕПАРХІІ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ?

Магілёўская праваслаўная епархія, утвораная ў 1632 годзе, вельмі моцна пацярпела ў час Паўночнай вайны, як ад войскаў Карла XII, так і ад войскаў Пятра I. З 1712 года ў Рэчы Паспалітай магілёўскі праваслаўны епіскап быў адзіным праваслаўным беларускім епіскапам. 28 лістапада 1720 года выйшаў каралеўскі прывілей Аўгуста II аб адзінай праваслаўнай епархіі ў РП з дзвюма кафедрамі: Св.Троіцы ў Мсціславе, і Спаскай у Магілёве.

Да таго ж з 1685 года Кіеўская праваслаўная мітраполія, якая прызначала епіскапаў на Магілёўскую праваслаўную епархію, перайшла пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхата. Гэта было падцверджана дамовай 1686 г. паміж Расіяй і РП, і ратыфікавана сеймам у 1710 годзе. Быў дадзены дазвол маскоўскаму патрыярхату прызначаць епіскапаў на адзіную праваслаўную епархію РП — Магілёўскую. У 1721 г. адбылася царкоўная рэформа ў Расіі. Згодна з царскім маніфестам, была ўтворана Духоўная калегія ці Свяцейшы Сінод. Ён ураўнаваў членаў Сіноду з чыноўнікамі іншых дзяржаўных устаноў. Епіскапы Магілёўскія практычна сталі дзяржаўнымі чыноўнікамі Расіі, хаця належылі да РП і зацвярджаліся прывілеямі каралёў РП.

У 1718 г. у магілёўскай епархіі былі наступныя манастыры: Куцеінскі, Буйніцкі, Мсціслаўскі, Саламерэцкі, Маркаўскі, Магілёўскі, Шклоўскі, Горацкі, Полацкі, Вахорскі, Грывенскі, Друцкі, Дзісенскі, Крыжборскі, Невельскі —мужчынскія; Куцеінскі, Баркалабаўскі, Мазалаўскі, Касцюкоўскі — жаночыя. У 30-40-я гады XVIII ст. назіраюцца шматлікія ганенні на праваслаўных у РП. Значна скарацілася колькасць праваслаўных прыходаў, большая частка з іх перайшла ў унію. У другой палове XVIII ст. назіралася запусценне епархіі.



Мы разумеем, што гэтая сцэнка, адлюстраваная на здымку, можа сапсаваць настрой і нават абразіць эстэтычны густ нашых чытачоў. Прыносім свае прабачэнні, хаця і заўважым пры гэтым, што газета —не галерэя высокага мастацтва, а адбітак рэальнага жыцця.

Надта ўдала схапіў фотакарэспандэнт сутнасць і змест сённяшняга палітыка-сацыяльнага настрою "простых людзей", а тое і ўсяго грамадства. Гэтая разгубленая, заблытаная і падманутая ў сваіх надзеях жанчына менавіта такім чынам адрэагавала на журналісцкую спробу выклікаць яе на гаворку аб хвалюючых праблемах. Яна, па ўсяму відаць, бездакорна і, няхай нас даруе, бяздумна ва ўсім, як і многія-многія іншыя чэпала ўслед за сваім прэзідэнтам. Як яму хацелася, так і галасавала. Што ён казаў, тое і падтрымлівала. Чаму ён вучыў — тое і рабіла... І раптам убачыла, што ўсё навокал хлусня, цынізм і няшчырасць. Адно і засталося: а, ідзіце вы ўсе!

Вось гэта і ёсць адзіны і самы рэальны вынік "для народа" двухгадовага кіравання краінай нашага першага прэзідэнта.

Адказы на крыжаслоў, апублікаваны ў мінулым нумары (7) Тыднёвіка

ПАГАРЫЗАНТАЛІ: 5.Варыўня. 6.Нязгода. 9.Коска. 10.Стырно. 11.Скрыль. 14.Мара. 16.Панарад. 17.Вока. 19.Ружоўнік. 20.Пачостка. 22.Гура. 24.Скляпок. 25. Сажа. 29.Сведка. 30.Дранік. 31.Прага. 33.Абалона. 34. Ваверка.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.Тытунь. 2.Юнак. 3.Ляда. 4.Угодкі. 5.Вестка. 7.Асілак. 8.Асушак. 12.Часінка. 13.Далакоп. 14.Мурог. 15.Атоса. 17.Вісус. 18.Асада. 21.Ляскат. 23.Ухвала. 26.Жмінда. 27.Скобля. 28.Драсён. 31. Паня. 32.Апал.

Юрась ДЗЕГЦЯРОЎ

Што можа горай быць на свеце,
калі твой дом не для цябе,
калі квітнеючае лісце
халодны вецер атрасе?
Што можа горай быць на свеце,
калі чужы у дом пранік,
і ўжо цікуе у закуце
не свой — расейскі дамавік?!
Што можа горай быць на свеце,
калі няшчасце у сям'і,
калі нястача, ліхалецце
пануюць на тваёй зямлі?!
Але ж я веру: гора сыдзе,
дождж змые бруд гадоў прымусу,
ў блакітным небе сонца ўзыдзе
і дасць Свабоду беларусам!!!

Напярэдадні падзеі

23-га мая Магілёўскі лялечны тэатр будзе адзначаць сваё 20-годдзе. Творчы калектыў тэатра запрашае ўсіх аматараў сцэнічнага мастацтва ў гэты дзень у 15 гадзін на святочную праграму "Нам — 20 гадоў". Юбілейная імпрэза абяцае быць надта цікавай яшчэ і таму, што... Але гэта — сюрпрыз, які чакае вас падчас прэм'еры.

Рэдактар Генадзь СУДНІК





Інфармацыйна-аналітычная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".


Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..





АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212030 г. Магілёў,
вул. Першамайская, 6-22.



ТЭЛЕФОНЫ:
31-04-15,
22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 8. Тыраж 2100 асобнікаў. Кошт 2000 руб.